# ДЫЯЛЕКТАЛАГІЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ: З ПАЛЯВЫХ ЗАПІСАЎ СТУДЭНТАЎ

---

*Х.П. Варонька*

## З гаворкі вёскі Заазер’е Лагойскага раёна Мінскай вобласці

Матэрыялы сабраныя ў 2009 г. студэнткай аддзялення “Беларуская філалогія” БДУ Хрысцінай Паўлаўна Варонька.

Запіс праводзіўся ў в. Заазер’е, што знаходзіцца ў Лагойскім сельсавеце Лагойскага раёна Мінскай вобласці. Ад раённага цэнтра Лагойска – 4 км, ад абласнога цэнтра Мінска – каля 40 км. У вёсцы 50 двароў. Жыхары з’яўляюцца беларусамі і называюць сябе *вансачамі*.

**Інфарматары:**

1) *Кавалёва Ірына Міхайлаўна*, 1947 г. н., адукацыя 10 класаў, нарадзілася ў в. Заазёр’е Лагойскага раёна Мінскай вобласці – [КІМ].
2) *Селіванава Клаўдзія Міхайлаўна*, 1949 г. н., адукацыя 7 класаў, нарадзілася ў в. Заазёр’е Лагойскага раёна Мінскай вобласці – [СКМ].
3) *Хадасевіч Ганна Матвееўна*, 1926 г. н., адукацыя 7 класаў, нарадзілася ў в. Рудня Лагойскага раёна Мінскай вобласці, ў в. Заазёр’е пераехала ў 1979 г. – [ХГМ].

### Пра заазёрскае возера

У да́ўнія часы́ паста́вілі, нам тут царкву́, а мы шчэ тады́ пага́намі былі́. У царкоў ніхто не хадзі́ў. Божанька згне́ваўся на нас, і за водну ночку правалі́лася царква́, пад зе́млю. На гэ́тым ме́сцы за́раз возера вялі́кае. [КІМ]

### Аповед пра закапаны скарб

Гавораць, што тут дзе́та каля возера клад зары́ты, які́сьці паніч яго прыхава́ў і, кана́ўшы не паспе́ў каму́-та расказа́ць пра яго, а можа, і не хаце́ў. Дык яго слу́жака адзінажды падслу́хаў, брадоціну сонную свайго па́на, дый пайшоў, шука́ць грошы. Доўга хадзі́ў, але нічагу́ся не найшоў. І сёння шука́юць гэты клад. [СКМ]

### Легенда пра замак

Ме́сца гэта так і называ́ецца “За́мак”. Гэта, наве́рна, са́мая высокая точка ў нас. Жыў тут калісь не́йкі князь, было ў яго шмат грошаў, які́я ён збіра́ў і закопваў пад му́рам свайго шыкоўнага за́мка. Памёр ён неяк знячэ́ўку і нікому сказа́ў, дзе грошы схарані́ў. Пайшоў адзінажды адзін смяля́ка шука́ць гэ́тыя

Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)

грошы. Толькі ўткнуў лапа́ту ў зямлю́, знік сам, і ніхто яго больш ня ба́чыў. Шука́ць тыя грошы ня хадзі́ў ніхто, але ўсе зна́юць, што нешта там ёсць. [ХГМ]

## Пра паходжанне вёскі Панізоўе

Жыла калі́сь тут адна па́нначка Зоя, была́ яна ве́льмі капры́зная, свавольная. Аднаго ра́зу, спяша́ючыся на ба́лю, скама́ндавала е́хаць пра́ма праз багну. Ну і пае́халі. Загра́зла карэ́та. Служакі не́як вы́лезлі, а па́нначку вы́цягнуць не паспе́лі. Ста́лі называ́ць вёску Панізоўе, г. зн. вёска па́ні Зоі. [ХГМ]

Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)